# Канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з’явамі (Стамбульская канвенцыя):

## пытанні і адказы







COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L’EUROPE



Гвалт у адносінах да жанчын - гэта структурная і глабальная з’ява, якая не ведае сацыяльных, эканамічных і нацыянальных межаў. Ён з’яўляецца сур’ёзным парушэннем правоў чалавека, якое вельмі часта застаецца беспакараным. Кожны дзень у Еўропе жанчыны сутыкаюцца з псіхалагічным і фізічным гвалтам у так званай «бяспецы» сваіх уласных дамоў, іх пераследуюць, цкуюць, гвалцяць, калечаць, іх сваякі прымушаюць іх уступіць у шлюб або быць стэрылізаванымі супраць іх волі. Прыклады гвалту ў адносінах да жанчын бясконцыя, яго ахвяры незлічоныя. Нацыянальныя і еўрапейскія даследаванні і інфармацыйныя кампаніі паказалі, наколькі шырока распаўсюджаны хатні і сексуальны гвалт. Факты, якія выйшлі на паверхню па ўсёй Еўропе ў межах руху «#MeToo», праліваюць святло на маштабы сексуальнага гвалту ў адносінах да жанчын і на тое, наколькі цяжка жанчынам выказвацца супраць яго. Многія жанчыны баяцца або саромеюцца звярнуцца па дапамогу і часам расплачваюцца за сваё маўчанне жыццём. Тыя ж, хто спрабуе выказацца, не заўсёды бываюць пачутыя. Хатні гвалт – яшчэ адна надзвычай распаўсюджаная форма гвалту, якая закранае ў асноўным жанчын, але таксама мужчын, дзяцей і пажылых людзей. Мала хто са злачынцаў бывае прыцягнуты да судовай адказнасці, яшчэ меншая колькасць бывае асуджаная.

Узяўшы на сябе вядучую ролю ў абароне правоў чалавека, Рада Еўропы прыняла Канвенцыю аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі (вядомую як «Стамбульская канвенцыя»). Стамбульская канвенцыя шырока прызнаная самым маштабным прававым інструментам для прадухілення гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі, якія разглядаюцца як парушэнне правоў чалавека. Ад таго часу, калі Канвенцыя была адкрытая для падпісання ў 2011 годзе, яна атрымала значную падтрымку на ўсіх узроўнях: з боку нацыянальных, рэгіянальных і мясцовых органаў улады, грамадскасці, парламентаў, іншых нацыянальных, рэгіянальных і міжнародных праваабарончых арганізацый, арганізацый грамадзянскай супольнасці, СМІ і навуковых колаў. Ёй былі прысуджаныя нацыянальныя і міжнародныя ўзнагароды за прасоўванне ідэі абароны жанчын і дзяўчатак ад гвалту.

Канвенцыя ўступіла ў сілу ў 2014 годзе - усяго праз тры гады пасля яе прыняцця, дэманструючы такім чынам як патрэбу дзяржаў-удзельніц у юрыдычна абавязальным пагадненні, якое кіравала б імі ў іх намаганнях па спыненні гендарнага гвалту, так і іх палітычную адданасць прынцыпам і каштоўнасцям, замацаваным у Канвенцыі.

Нягледзячы на выразна сфармуляваныя мэты Канвенцыі, сур'ёзнасць з'явы і яе ўплыў на ахвяр і грамадства, шэраг рэлігійных і ультракансерватыўных груп на працягу апошніх гадоў распаўсюджваюць скажоныя інтэрпрэтацыі Канвенцыі, асабліва ў дачыненні да ўключанай у тэкст канцэпцыі «гендару». Гэтыя скажэнні неабходна выкрываць і абвяргаць, падкрэсліваючы мэты Стамбульскай канвенцыі: выкараненне гвалту ў адносінах да жанчын і абарона іх правоў.

## ЯКІЯ МЭТЫ СТАМБУЛЬСКАЙ КАНВЕНЦЫІ?

Спыненне гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту павінна стаць важнай палітычнай мэтай любога ўраду, які імкнецца абараняць правы чалавека для ўсіх. За апошнія 30 гадоў шэраг дзяржаў-удзельніц Рады Еўропы зрабілі шмат важных крокаў у гэтым накірунку, але дзеючае заканадаўства часта выконваецца не ў поўнай меры, паслугі для ахвяр гвалту прапаноўваюцца рэдка або не маюць дастатковага фінансавання, а сексісцкія погляды ўсё яшчэ шырока распаўсюджаныя. У дадатак, дзеючае заканадаўства і падтрымка моцна адрозніваюцца ў розных краінах, ствараючы велізарныя дыспрапорцыі ва ўзроўні абароненасці.

Стамбульская канвенцыя патрабуе ад урадаў, якія яе ратыфікавалі, прыняць усёахопны комплекс мер па барацьбе з усімі формамі гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту. Кожнае палажэнне Канвенцыі мае на мэце прадухіляць гвалт, дапамагаць ахвярам і забяспечваць прыцягненне вінаватых да адказнасці. Гэта патрабуе крыміналізацыі і пакарання паводле закону розных форм гвалту ў адносінах да жанчын, напрыклад, хатняга гвалту, праследавання, сексуальных дамаганняў і псіхалагічнага гвалту. Распазнаванне гвалту ў адносінах да жанчын і ўсведамленне таго, што гвалт з'яўляецца злачынствам, дапаможа пакласці яму канец.

Распрацоўка Канвенцыі, якая змяшчае набор юрыдычна абавязальных стандартаў для лепшай абароны і падтрымкі, з'яўляецца важным крокам да рэалізацыі комплексных і збалансаваных дзеянняў, пакліканых забяспечыць жыццё без гвалту ўсім жанчынам.

## У ЧЫМ ДАДАТКОВАЯ ВАРТАСЦЬ СТАМБУЛЬСКАЙ КАНВЕНЦЫІ?

Канвенцыя ясна дэманструе, што гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт больш не могуць разглядацца як прыватная справа, а дзяржавы абавязаныя шляхам комплекснай і інтэграванай палітыкі прадухіляць гвалт, абараняць ахвяр і караць вінаватых. Прымаючы Канвенцыю, урады абавязваюцца змяніць сваё заканадаўства, увесці практычныя меры і вылучыць рэсурсы, каб забяспечыць нулявую цярпімасць да гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту. Прадухіленне такога гвалту і барацьба з ім робяцца ўжо не пытаннем добрай волі, а юрыдычным абавязацельствам. Гэта дапаможа ахвярам гвалту па ўсёй Еўропе і за яе межамі.

Акрамя юрыдычных абавязацельстваў, Канвенцыя таксама дае важны палітычны сігнал грамадству ў цэлым аб недапушчальнасці гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту. Яе мэта - праліць святло на рэальнае жыццё многіх жанчын і дзяўчатак, якія падвяргаюцца гвалту, павысіць узровень усведамлення праблемы і ў доўгатэрміновай перспектыве змяніць менталітэт.

## СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА ТОЛЬКІ НА ЖАНЧЫН?

Не. Канвенцыя распаўсюджваецца ў асноўным на жанчын, таму што яна ахоплівае формы гвалту, з якімі сутыкаюцца выключна жанчыны з-за таго, што яны жанчыны (прымусовы аборт, калечанне жаночых палавых органаў), або з якімі  жанчыны сутыкаюцца значна часцей, чым мужчыны (сексуальны гвалт і згвалтаванне, праследаванне, сексуальныя дамаганні, хатні гвалт, прымусовы шлюб, прымусовая стэрылізацыя). Гэтыя формы гвалту з'яўляюцца вынікам нераўнапраўных адносін паміж мужчынамі і жанчынамі і наступствам дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын.

Тым не менш, мужчыны таксама сутыкаюцца з некаторымі формамі гвалту, якія ахоплівае Канвенцыя, такімі як хатні гвалт і прымусовы шлюб, хаця гэта адбываецца радзей і часта ў менш жорсткіх формах. Прызнаючы гэта, Канвенцыя заклікае ўдзельнікаў распаўсюджваць яе палажэнні на ўсіх ахвяр хатняга гвалту, уключна з  мужчынамі, дзецьмі і пажылымі асобамі. Дзяржавы могуць самі вырашаць, ці будуць яны прымяняць Канвенцыю ў дачыненні да гэтых ахвяр хатняга гвалту.

## ЧАМУ СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ ГАВОРЫЦЬ ПРА «ГЕНДАРНЫ ХАРАКТАР» ГВАЛТУ Ў АДНОСІНАХ ДА ЖАНЧЫН І ХАТНЯГА ГВАЛТУ?

Канвенцыя гаворыць аб «гендарным» характары гвалту ў адносінах да жанчын або «гендарным гвалце», таму што яна датычыць тых формаў гвалту, якія скіраваныя супраць жанчын з-за таго, што яны з'яўляюцца жанчынамі, і/або ў большай ступені закранаюць жанчын (гл. вышэй). Гэта адна з прычын таго, чаму немагчыма змагацца з гвалтам у адносінах да жанчын і хатнім гвалтам без уліку пытанняў гендарнай роўнасці.

Такім чынам, Канвенцыя ставіць выкараненне гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту ў кантэкст дасягнення юрыдычнай і фактычнай гендарнай роўнасці. Ейная прэамбула прызнае структурны характар такога гвалту, які з'яўляецца як прычынай, так і наступствам нераўнапраўных адносін паміж жанчынамі і мужчынамі і які не дазваляе дасягнуць поўнамаштабнага паляпшэння становішча  жанчын.

Стамбульская канвенцыя не імкнецца «скасаваць адрозненні» паміж жанчынамі і мужчынамі і ня мае на ўвазе, што жанчыны і мужчыны з’яўляюцца або павінны быць «аднолькавымі». Тым не менш, Канвенцыя патрабуе супрацьстаяння ідэі, што жанчыны стаяць ніжэй за мужчын. Сапраўды, забабоны, стэрэатыпы, звычаі і традыцыі па-ранейшаму спрыяюць мужчынам у многіх сітуацыях, напрыклад, у прыватнай і грамадскай сферах, палітычным жыцці, на працы, у сістэмах адукацыі, пры падачы заявы аб злачынстве ў паліцыю або падчас судовых працэсаў. З-за гэтага жанчынам нашмат цяжэй раскрываць інфармацыю пра перанесены гвалт і адстойваць свае правы.

## ЧАМУ СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ ЎТРЫМЛІВАЕ ВЫЗНАЧЭННЕ «ГЕНДАРУ»?

Канвенцыя ставіць абавязацельствы па прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і барацьбе з ім у шырэйшы кантэкст барацьбы за дасягненне роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі. Распрацоўшчыкі, такім чынам, звяртаюцца да адносін паміж жанчынамі і мужчынамі, іх роляў і характарыстык у грамадстве, і таму ўважаюць неабходным даць вызначэнне тэрміна «гендар». Гэты тэрмін прызначаны не замяніць біялагічнае вызначэнне «полу» або тэрмінаў «жанчыны» і «мужчыны», а падкрэсліць, што прычыны няроўнасці, стэрэатыпаў і, у выніку, гвалту караняцца не ў біялагічных адрозненнях, а хутчэй у сацыяльных канструкцыях, г. зн. у поглядах і ўяўленнях аб тым, кім ёсць і якімі павінны быць жанчыны і мужчыны ў грамадстве.

Такім чынам, артыкул 3.с. тлумачыць, што з пункту погляду Канвенцыі «гендар» - гэта «сацыяльна замацаваныя ролі, паводзіны, дзеянні і характарыстыкі, якія пэўнае грамадства ўважае за адпаведныя жанчынам і мужчынам». Даследаванні паказалі, што пэўныя ролі або стэрэатыпы ўзнаўляюць непажаданыя і шкодныя практыкі і спрыяюць таму, каб гвалт у адносінах да жанчын ўважаўся прымальным. Таму ў артыкуле 12 (1) выкараненне забабонаў, звычаяў, традыцый і іншых практык, заснаваных на ідэі непаўнавартасці жанчыны або на стэрэатыпных гендарных ролях, разглядаецца як агульнае абавязацельства па прадухіленні гвалту. У сваю чаргу, разуменне ўплыву такіх забабонаў, звычаяў і традыцый дазваляе ўрадам прыйсці да «гендарнага разумення» гвалту, як таго патрабуе Канвенцыя.

Вызначэнне тэрміна «гендар» таксама дапамагае зразумець вызначэнне паняцця «гендарны гвалт ў адносінах да жанчын», што азначае «гвалт, накіраваны супраць жанчыны таму, што яна жанчына, або які несувымерна закранае жанчын», як гэта вызначана ў артыкуле 3.d.

Тэрмін «гендар» сустракаецца ў міжнародных прававых дакументах не ўпершыню. Тым не менш, цяжкасці, звязаныя з перакладам тэрміну «гендар», і яго адрозненні ад тэрміну «пол» у мовах, якія не маюць дакладнага эквіваленту, часам выкарыстоўваліся для распальвання спрэчак адносна Канвенцыі і яе наступстваў. Гэтыя цяжкасці не могуць стаць падставай для адмовы ад Канвенцыі або перашкодай для яе рэалізацыі: Канвенцыя не патрабуе мяняць нацыянальныя прававыя сістэмы, уводзячы ў іх тэрмін «гендар», а выкарыстоўвае яго, каб патлумачыць мэты тых захадаў, якія паводле Канвенцыі дзяржавы мусяць прыняць і ажыццявіць. Канвенцыя ўжо была ратыфікаваная і рэалізаваная ў краінах, мовы якіх не маюць дакладнага эквіваленту тэрміну «гендар» (гэтыя мовы належаць да розных моўных груп, напрыклад, германскай, раманскай, славянскай і г.д.), што не выклікала аспрэчання.

## ЦІ МОЖА ПАШЫРЭННЕ ПРАВОЎ ЖАНЧЫН СТАЦЬ ПАГРОЗАЙ ДЛЯ СЕМ'ЯЎ?

Мэтай Канвенцыі не з'яўляецца рэгуляванне сямейнага жыцця і/або сямейных структур; яна не ўтрымлівае вызначэння «сям'і» і не прасоўвае пэўны тып сямейнага ўладкавання. Канвенцыя патрабуе ад урадаў гарантаваць бяспеку ахвяр, якім пагражае небяспека дома або ад членаў сям'і, сужэнцаў або блізкіх партнёраў, што, на жаль, з'яўляецца найбольш распаўсюджанай формай гвалту.

Паколькі мэтай Канвенцыі з'яўляецца барацьба з гвалтам у адносінах да жанчын і хатнім гвалтам, дзе б ён ні адбываўся, яна распаўсюджвае сваё дзеянне не толькі на партнёраў, якія знаходзяцца ў законным шлюбе, але і на ўсіх партнёраў, жанатых або нежанатых, аднаполых або рознаполых. Ніякія групы ахвяр не выключаюцца са сферы абароны на падставе іх сямейнага становішча або паводле любой іншай прыкметы дыскрымінацыі, ахопленай Канвенцыяй.

Канвенцыя імкнецца прадставіць бяспеку, абарону і падтрымку тым, хто жыве ва ўмовах жорсткага абыходжання, а таксама даць ім магчымасць адбудаваць іхняе жыццё без гвалту. Гэта асабліва важна ў выпадках, калі задзейнічаныя дзеці, таму што быць сведкамі гвалту ў сям'і таксама вельмі шкодна. Гэта мае пажыццёвыя наступствы для дзяцей, таму Канвенцыя аддае перавагу бяспецы перад правам апекі ў сем'ях, дзе прысутнічае гвалт. Стамбульская канвенцыя не ставіць пад сумненне карысць сумеснай апекі над дзецьмі, але мае за мэту забяспечыць, каб кантакты з дзецьмі не ставілі пад пагрозу правы і бяспеку ахвяр і дзяцей. Сапраўднай пагрозай для сем'яў з'яўляецца сам гвалт, а не меры, накіраваныя на абарону і падтрымку яго ахвяр.

## ШТО КАЖА СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ ПРА ГЕНДАРНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ І АДУКАЦЫЮ?

Паўтарэнне гендарных стэрэатыпаў у адукацыі азначае абмежаванне развіцця прыродных талентаў і здольнасцей дзяўчатак і хлопчыкаў, іх адукацыйнага і прафесійнага патэнцыялу, а таксама іх жыццёвых перспектыв. Адукацыя, якую атрымліваюць дзеці, значна ўплывае на тое, як яны ўспрымаюць сябе, сваіх аднагодкаў і як яны ўзаемадзейнічаюць з іншым полам. Нічога з таго, што выкладаюць у навучальных установах, не павінна даваць маладому пакаленню падставы думаць, што дыскрымінацыя па прыкмеце полу і гвалт у адносінах да жанчын могуць быць прымальнымі.

Таму Стамбульская канвенцыя імкнецца прасоўваць праз сектар адукацыі каштоўнасці гендарнай роўнасці, узаемапавагі і адмовы ад гвалту ў міжасабовых адносінах, нестэрэатыпных гендарных роляў, права на асабістую недатыкальнасць і інфармаванасць аб гендарным гвалце і разуменне неабходнасці яму супрацьстаяць (артыкул 14). Навучанне дзяцей такім каштоўнасцям дапамагае ім стаць выхаванымі і дэмакратычнымі грамадзянамі. Гэта не ўплывае на іх сексуальную арыентацыю або гендарную ідэнтычнасць.

Распрацоўшчыкі Канвенцыі ўважаюць гэты аспект важным у справе прафілактыкі гвалту ў адносінах да жанчын, таму што погляды, перакананні і паводзінныя мадэлі фармуюцца ў вельмі раннім узросце. Навучанне вышэйзгаданым каштоўнасцям у сферах фармальнай і нефармальнай адукацыі можа ў значнай ступені дапамагчы засвоіць ідэю непрымальнасці гвалту ў адносінах да жанчын. Артыкул 14 прапануе дзяржавам-удзельніцам максімальную

гнуткасць у гэтым пытанні, бо рашэнне аб тым, калі і якім чынам будуць выкладацца гэтыя каштоўнасці, аддаецца на іх уласнае меркаванне.

Выкараненне гендарных стэрэатыпаў не азначае адмову ад усіх традыцый і звычаяў. Перадача звычаеў і поглядаў з пакалення ў пакаленне важная для фармавання нашай ідэнтычнасці. Аднак некаторыя звычаі і традыцыйныя практыкі шкодныя для жанчын і дзяўчатак і могуць паставіць іх пад пагрозу гвалту. Таму мэта мусіць палягаць у разбурэнні тых стэрэатыпаў у дачыненні да жанчын і мужчын, якія выкарыстоўваюцца для апраўдання такіх шкодных традыцый. Гаворка ідзе аб тым, каб гарантаваць бяспеку жанчын і дзяўчатак у сям'і і па-за ёй, а не аб тым, каб «прапаноўваць хлопчыкам апранацца або гуляць як дзяўчаткі» і наадварот.

## ЯК СТАМБУЛЬСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ РАЗГЛЯДАЕ ПЫТАННІ СЕКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ І ГЕНДАРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ?

Стамбульская канвенцыя не ўсталёўвае новых стандартаў у дачыненні да гендарнай ідэнтычнасці і сексуальнай арыентацыі, у тым ліку ў дачыненні да юрыдычнага прызнання аднаполых пар.

Прынцып недыскрымінацыі па прыкмеце гендарнай ідэнтычнасці або сексуальнай арыентацыі абапіраецца на прававыя абавязацельствы, якія вынікаюць з іншых прававых дакументаў, перш за ўсё з Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека (артыкул 14: Забарона дыскрымінацыі; пратакол № 12) і з практыкі Еўрапейскага суда па правах чалавека (гл., напрыклад, Аліары супраць Італіі, 2015, Рацэнбэк і Зайдэль супраць Аўстрыі, 2017), а таксама з Рэкамендацыі (2010)5 Камітэта міністраў Рады Еўропы дзяржавам-удзельніцам аб мерах па барацьбе з дыскрымінацыяй па прыкмеце сексуальнай арыентацыі або гендарнай ідэнтычнасці.

Стамбульская канвенцыя забараняе дыскрымінацыю па многіх прыкметах, у тым ліку па прыкмеце гендарнай ідэнтычнасці і сексуальнай арыентацыі (артыкул 4, пункт 3). Гэта неабходна, каб забяспечыць абарону і падтрымку ўсім ахвярам гвалту, незалежна ад іх асаблівасцяў. Прымяненне палажэнняў Канвенцыі без аніякай дыскрымінацыі па прыкмеце гендарнай ідэнтычнасці азначае, напрыклад, што гендарная ідэнтычнасць трансгендарных асоб не павінна перашкаджаць ім атрымліваць падтрымку і абарону, гарантаваную ў выпадках хатняга гвалту, сексуальнага гвалту, згвалтавання або прымусовага шлюбу. Тое ж самае тычыцца

жанчын у аднаполых адносінах, з тым каб усе жанчыны, у тым ліку лесбіянкі, бісексуальныя і транссексуальныя жанчыны мелі, напрыклад, доступ да прытулкаў для ахвяр хатняга гвалту і ім было забяспечане права жыць без гвалту. Сюды таксама могуць быць уключаныя гомасексуальныя мужчыны, якія сутыкаюцца з хатнім гвалтам.

## ЧАС СПЫНІЦЬ СПЕКУЛЯЦЫІ І ДЭЗІНФАРМАЦЫЮ АБ СТАМБУЛЬСКАЙ КАНВЕНЦЫІ

У Стамбульскай канвенцыі няма падтэксту або «схаванага парадку дня». Стамбульская канвенцыя з’яўляецца вынікам працяглых перамоваў, якія прывялі да яе прыняцця на падставе кансэнсусу усімі дзяржавамі-удзельніцамі Рады Еўропы. Яна заснаваная на выпрабаванай палітыцы і заканадаўстве, якія далі станоўчыя вынікі на ўзроўні дзяржаў-удзельніц.

Яе мэты дакладна сфармуляваныя ў артыкуле 1: прадухіленне гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту, абарона і судовы пераслед. Гэта азначае ліквідацыю галоўнай першапрычыны гвалту – няроўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі ў нашых грамадствах. Вось чаму Канвенцыя змяшчае некалькі палажэнняў, якія аспрэчваюць устойлівыя ідэі аб непаўнавартасці жанчын у параўнанні з мужчынамі і аб ролях і паводзінах жанчын і мужчын у прыватнай і грамадскай сферах.

З гэтага пункту гледжання Стамбульская канвенцыя не вылучае парадку дня, які б «паставіў пад пагрозу» сацыяльную структуру і каштоўнасці грамадства. Яна таксама не навязвае жанчынам і мужчынам нейкага жыццёвага выбару. Незалежна ад таго, жадаюць яны быць апекунамі, бацькамі або выбраць бліскучую кар’еру, Канвенцыя не абавязвае нікога да пэўнага ладу жыцця. Канвенцыя, аднак, супрацьстаіць спробам, накіраваным на:

- абмежаванне жанчын і мужчын традыцыйнымі ролямі, тым самым абмяжоўваючы іх асабістае, адукацыйнае і прафесійнае развіццё і жыццёвыя магчымасці ў цэлым;
- апраўданне і захаванне патрыярхату, гістарычных адносін дамінавання мужчын над жанчынамі, а таксама сексісцкіх поглядаў, якія стрымліваюць прасоўванне гендарнай роўнасці;
- супрацьстаянне ідэі права жанчын на жыццё без гвалту.

## БЫЦЬ УДЗЕЛЬНІКАМ СТАМБУЛЬСКАЙ КАНВЕНЦЫІ: АБ'ЯДНАЦЦА ДЗЕЛЯ СПЫНЕННЯ ГВАЛТУ Ў АДНОСІНАХ ДА ЖАНЧЫН

Стамбульская канвенцыя ўжо робіць станоўчы ўплыў на жыццё жанчын па ўсёй Еўропе. Патрабаваць ад ўрадаў прадухілення гвалту ў адносінах да жанчын, абароны і падтрымкі ахвяр і пакарання вінаватых у комплексных намаганнях пакласці канец такому гвалту азначае вярнуць жанчынам-ахвярам іх годнасць, якая з'яўляецца каштоўнасцю першараднага значэння ў адпаведнасці з Еўрапейскай канвенцыяй па правах чалавека (Й.Й. супраць Турцыі, 2015 г.), і перавесці працу па забеспячэнні асноўных правоў жанчын са сферы дабрачыннасці ў цэнтр дзяржаўнай палітыкі.

Стамбульская канвенцыя ініцыявала і прывяла да важных змен у заканадаўстве, стварэння новых і больш якасных службаў для ахвяраў гвалту, размеркавання рэсурсаў і актывізацыі намаганняў па падрыхтоўцы кадраў. Канкрэтныя прыклады з краін, якія выконваюць Канвенцыю, уключаюць: прыняцце заканадаўства, якое ўводзіць новыя вызначэнні пераследу і сексуальных дамаганняў; змена вызначэння згвалтавання як дзеяння, заснаванага на адсутнасці згоды, а не на даказаным ужыванні сілы; стварэнне «каардынаваных службаў рэагавання супольнасці», дзе спецыялісты, да якіх звяртаюцца ахвяры, будуць перадаваць справу міждысцыплінарнай групе для забеспячэння падтрымкі; стварэнне нацыянальных тэлефонных ліній даверу, адкрытых круглыя суткі сем дзён на тыдзень, якія накіроўваюць жанчын у бліжэйшыя да іх кансультацыйныя цэнтры; стварэнне фінансаваных дзяржавай прытулкаў там, дзе іх раней не было; увядзенне тэмы гвалту ў адносінах да жанчын у навучальныя праграмы вышэйшых навучальных установаў (па спецыяльнасцях права, медыцыны, працы медсёстраў, псіхалогіі, сацыяльных навук і г.д.); правядзенне спецыяльнай падрыхтоўкі для суддзяў, пракурораў і адвакатаў для паляпшэння доступу жанчын да абароны і ейных прававых сродкаў.

У агуле, Стамбульская канвенцыя стварыла штуршок для паляпшэння палітыкі, паслугаў і дыскурсаў вакол праблемаў гвалту, з якім сутыкаюцца жанчыны і дзяўчаткі, і таго, як можна іх падтрымаць і пашырыць іх правы і магчымасці. Прафесіяналы на ўсіх узроўнях (праваахоўныя органы, сацыяльныя службы, службы кансультацыі і падтрымкі і г.д.) скарысталіся гэтым новым імпульсам і сталі сведкамі больш глыбокага ўсведамлення праблемы. Наспела неабходнасць дзейнічаць. Выкараненне гвалту ў адносінах да жанчын павінна стаць мэтай, якая аб'ядноўвае ўсіх нас.

Стамбульская канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з’явамі: прадухіленне гвалту, абарона ахвяр і судовы пераслед вінаватых у барацьбе з гэтым сур’ёзным парушэннем правоў чалавека.

**www.coe.int/conventionviolence**

**conventionviolence@coe.int**

PREMS 131823

BEL

**www.coe.int**

Савет Еўропы з’яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне праў чалавека. У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 46 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Праў чалавека і асноўных свабод -дамову, распрацаваную для абароны праў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закона. Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах.

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L’EUROPE